✓**27 жніўня** ў НББ пачала працу кніжная выстава **«Сусвет Станіслава Лема»**, прымеркаваная да 100-годзя з дня нараджэння сусветна вядомага фантаста. Глыбокі мысляр, філосаф, гісторык культуры, футуролаг, фельетаніст, публіцыст і паэт, у сваёй творчасці Лем даследаваў мноства тэмаў: кібернетыка і штучны інтэлект, развіццё тэхналогіяў і віртуальная рэальнасць, міжзорныя вандроўкі і магчымасць кантакту з пазазямнымі цывілізацыямі. Яго творы перакладзеныя больш чым на 40 моваў, іх наклады перавысілі 30 мільёнаў асобнікаў.

На выставе прадстаўленая адзіная ў краіне максімальна поўная кніжная калекцыя

кампетэнтнага лемолага, перакладчыка твораў і даследчыка творчасці С. Лема, кандыдата тэхнічных навук Віктара Язневіча. Калекцыя ўключае больш за 800 кніг, выдадзеных у 43-х краінах свету, прыжыццёвыя выданні твораў, асобнікі з аўтографамі і ўладальніцкімі пазнакамі, даследаванні і матэрыялы з канферэнцыяў і мерапрыемстваў, прысвечаных асобе і творчасці пісьменніка.

Бліжэй пазнаёміцца з асобаю выбітнага польскага пісьменніка можна да 31 снежня.